РОДНАЯ ГАЗЕТА НА РОДНАЙ МОВЕ

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

23 СТУДЗЕНЯ 2025 г. ЧАЦВЕР № 14 (30402)

26 студзеня 2025 ВЫБАРЫ ПРЭЗІДЭНТА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

# Гэта нам ТРЭБА!

## Актыўнасць на галасаванні з першых дзён – сведчанне сталасці грамадства




Курсанты Універсітэта грамадзянскай абароны галасавалі на ўчастку № 69 у сталіцы.

Фота Віктара ДРАЧОВА.

Беларусы ідуць на выбары — і гэта неаспрэчны факт. Ідуць з першага дня, як толькі гэта стала магчыма. Ужо ў першы дзень датэрмiновага галасавання яўка выбаршчыкаў склала 7,81 %. У Брэсцкай вобласці ў першы дзень атрымалі бюлетэні 8,95 % грамадзян, у Віцебскай — 7,45 %, у Гомельскай — 7,01 %, у Гродзенскай — 6,08 %, у Мінскай — 8,52 %, у Магілёўскай — 7,25 %, у Мінску — 8,54 %. Па выніку двух дзён гэтыя лічбы будуць значна большыя — учора людзі ва ўсіх рэгіёнах таксама актыўна ішлі на выбарчыя ўчасткі. Людзі ідуць выбіраць будучыню для сябе і сваіх дзяцей. Яны адчуваюць адказнасць за лёс любімай краіны. Сваю асабістую адказнасць, калі дакладна разумееш, што ад твайго выбару залежыць тое, як ты будзеш жыць заўтра. Гэта называецца сталае грамадства суверэннай краіны. Мы пацвярджаем, што да гэтага ганаровага звання дараслі.

СТАР. 4–7

ВАЛАНЦЁРЫ – ПРА ВЫБАРЫ 7



АД ЧАГО АБАРОНЯЦЬ НОВЫЯ ПРЫШЧЭПКІ 15



Яшчэ больш цікавых навін па-беларуску — у нашым тэлеграм-канале @zviazdaby. Падпісвайцеся, чытайце, будзьце ў курсе!

НА СЛЫХУ

# ПЕНСІЯ З ПРЫБАЎКАЙ

## Міністр працы і сацыяльнай абароны аб тым, як будуць расці выплаты




Заслухоўваючы даклад па мерах удасканалення сацыяльнай абароны насельніцтва ў кастрычніку мінулага года, кіраўнік дзяржавы звярнуў увагу, што ў сённяшняй сітуацыі і пенсіянераў, і інвалідаў, і дзяцей-сірот варта падтрымліваць, як толькі ў дзяржавы з'яўляюцца фінансавыя магчымасці. У чарговы раз можна ўпэўніцца, што словы Прэзідэнта не разышліся са справай. Беларуская эканоміка спрацавала са станоўчым вынікам, і зароблены сродкі было вырашана накіраваць на падтрымку найбольш уразлівых катэгорый насельніцтва. Днямі кіраўніком дзяржавы быў падпісаны Указ «Аб павышэнні пенсій», згодна з якім з 1 лютага яны ўзрастуць у сярэднім на 10 %. Якім у выніку будзе сярэдні памер пенсіі? Ад чаго залежыць іх павышэнне? Як сёлета будуць расці «ўзроставыя» даплаты да пенсіі? Аб гэтым «Звяздзе» расказала міністр працы і сацыяльнай абароны Наталля ПАЎЛЮЧЭНКА.

СТАР. 10

ISSN 1990 — 763X